# Белар. Дзярж. Бібліатэка.

Дзякуючы энэргіі здольнага свайго кіраўніка, Белар. Дзярж. Бібліатэка закончыла складаньне сыстэматычнага каталёгу, іначай кажучы, дабілася таго, што маюць далёка ня ўсе старыя дзярж. бібліатэкі Савецкага Саюзу. Наша маладая Дзярж. Бібліатэка мае зараз 190.000 томаў кніж. Так за 2 ½ гады вырасла яна. Узрост нябывалы, тлумачымы толькі нашымі ўмовамі творчай энэргіі маладое беларускае рэспублікі працоўных.

Але недахватам нашай Дзярж. і Унівэрсытэцкай Бібліатэкі зьяўляецца выпадковасьць яе кніжнага складу па усіх, бадай, навуковых аддзелах. У той час, як бібліатэка забясьпечана ўсімі навінкамі ўсерасейскага выдавецкага рынку, бракуе навуковых выданьняў былых да-рэвалюцыйных часоў, без якіх немагчыма сталая навуковая праца ў Менску для навуковых работнікаў Інбелкульту і абедзьвюх вышэйшых нашых школ.

Удалося згаварыцца з самымі буйнымі дзярж. бібліатэкамі Масквы і Ленінграду аб прадажы нашай бібліатэцы патрэбных ёй на папаўненьне выданьняў мінулых гадоў з іхных фондаў дублетаў.

Цэнтр. Вык. Камітэт адпусьціў ужо на гэта 5000 руб. і згадзіўся на штогодняе асыгнаваньне грошай на гэтую ж мэту ў далейшым.